где $\Delta C_{OSN}$– центральность, $\Delta d_{OSNij}$– структурная эквивалентность, а $K$ – минимально допустимый уровень структурно-функциональной организации *OSN*-сообщества, ниже которого происходит его деструкция (распад).

**Маркевіч С. А.**

## ПРАБЛЕМА ЗАХАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ЭПОХУ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

Сучасны перыяд многія даследчыкі называюць эпохай глабалізацыі. Гэты працэс выклікаў значныя зрухі ў нашай нацыянальнай культуры, абвастрыў яе праблемы. Беларуская нацыянальная культура аб'ектыўна функцыянуе ў кантэксце сусветнай глабальнай культуры, з'яўляючыся суб'ектам і аб'ектам міжкультурнага ўзаемадзеяння. Так, на працягу свайго развіцця беларуская культура заўсёды адчувала ўплыў іншых культур (рускай, літоўскай, украінскай, яўрэйскай, татарскай і іншых) і сама значна ўплывала на суседнія культуры. Блізкія ўзаемаадносіны былі абумоўлены геаграфічным становішчам, знаходжаннем на мяжы розных рэлігійных рэгіёнаў.

Глабалізацыя ў якасці адной з прыкмет азначае камерцыялізацыю культуры, узмацненне пазіцый забаўляльнай «поп-культуры», з-за чаго ўзнікае шэраг небяспек, звязаных са знікненнем шэрагу традыцыйных формаў нацыянальнай культуры; нівеліруючае ўздзеянне выяўляецца ў нейтралізацыі самабытнай народнай культуры. Дыяпазон выкарыстання нацыянальнай мовы і народнай мастацкай культуры звужаецца.

Ва ўмовах разгортвання глабалізацыі асаблівую значнасць і актуальнасць набываюць пытанні, звязаныя з захаваннем культурнай разнастайнасці, індывідуальнасці і непаўторнасці нацыянальных культур. У сувязі з гэтым даследчыкі ўсё часцей звяртаюць увагу на самабытнасць як на фундаментальную тыпастваральную якасць нацыянальна-культурнай цэласнасці. Уяўляецца актуальным ўдакладненне, сістэматызацыя і абагульненне асноўных структурна-змястоўных характарыстык і тыпалагічных асаблівасцяў у кантэксце супярэчнасцяў сучасных глабальных працэсаў. Так фармуюцца перадумовы ўзмацнення пазіцый традыцыйнай культуры як рэакцыя на глабальныя выклікі, адраджаецца цікавасць да гісторыі і традыцыйных формаў культуры.

Нацыянальная культура асвойвае магчымасці глабалізацыі (перш за ўсё інфармацыйна-тэхнічныя), атрымлівае магчымасць ўзбагачэння вопытам іншых культур, новымі мадэлямі трансляцыі і каштоўнаснымі сэнсамі. Ўзбагачэнне выяўляецца ў захаванні і актуалізацыі найбольш рэпрэзентатыўных тэкстаў і сімвалаў беларускай культуры, уключэнні нацыянальна афарбаваных тэкстаў у кантэксты агульначалавечай культурнай прасторы, фарміраванні культурна ўзбагачанага асяроддзя. Такім чынам, працэс глабалізацыі ў праекцыі на нацыянальную культуру можа разглядацца ў якасці важнай крыніцы яе развіцця.